**Т.В.Кузьмініч,** *дацэнт,*
**В.І.Саітава,** *дацэнт*

# СТАН І ПРАБЛЕМЫ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАГА І ІНФАРМАЦЫЙНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ "БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА. ТЭОРЫЯ, ГІСТОРЫЯ"

Вучэбная дысцыпліна "Бібліяграфазнаўства", уведзеная згодна новаму Адукацыйнаму стандарту па спецыяльнасці 1-23 01 11 – Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках), ахоплівае два раздзелы, вылучаныя на падставе аспектнай дыферэнцыяцыі бібліяграфазнаўства. Гэта "Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя" і "Бібліяграфазнаўства. Раздзел 2. Гісторыя". Такі падыход заканамерны і даволі ўсталяваны ў вучэбным працэсе. Але ў параўнанні з мінулымі гадамі другі раздзел падаецца аб'яднана і інтэгруе матэрыял дзвюх асобных дысцыплін "Сусветная гісторыя бібліяграфіі" і "Гісторыя беларускай бібліяграфіі".

У стандарце самастойнасць тэорыі і гісторыі бібліяграфазнаўства не акрэслена, прадметнае поле іх прадстаўлена абагульнена. Вывучаюцца ж яны студэнтамі ўсіх спецыялізацый факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) і на факультэце завочнага навучання (ФЗН) БДУ культуры і мастацтваў паасобку: спачатку тэарэтычны раздзел (на ФІДК у трэцім семестры), затым гістарычны (на ФІДК у чацвёртым семестры). Таму пры падрыхтоўцы новых тыпавых праграм па бібліяграфазнаўстве ўзніклі праблемы размежавання патрабаванняў стандарта адносна тэарэтычнай і гістарычнай частак, неабходнасці аб'яднання дзвюх выразна вызначаных, асобна забяспечаных метадычна і крыніцамі вучэбных дысцыплін "Сусветная гісторыя бібліяграфіі" і "Гісторыя беларускай бібліяграфіі", хаця ў пэўнай ступені прысутнічае і шкадаванне па прычыне страты самастойнасці вучэбнага курса "Гісторыя беларускай бібліяграфіі".

Актуальнасць вывучэння "Бібліяграфазнаўства. Раздзел 1. Тэорыя" і "Бібліяграфазнаўства. Раздзел 2. Гісторыя" абумоўлена фундаментальнай роляй тэарэтычных і гісторыка-бібліяграфічных ведаў у фарміраванні прафесійнай кампетэнцыі студэнтаў, іх прафесійнага светапогляду, неабходнасцю засваення спецыяльнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрміналогіі і базавых паняццяў, важнасцю пераемнасці каштоўнага гістарычнага вопыту, назапашанага сусветнай бібліяграфіяй у цэлым і беларускай бібліяграфіяй як яе неад’емнай часткай.

Вучэбна-метадычнае і інфармацыйнае забеспячэнне дысцыплін развіваецца з улікам існуючых нарматыўных і навукова-педагагічных патрабаванняў, ацэнкі вопыту вывучэння прадметаў студэнтамі, выяўлення найбольш эфектыўных формаў і метадаў. Першаступеннае значэнне для паспяховага вывучэння матэрыялу мае стварэнне вучэбна-метадычных комплексаў.

Склад вучэбна-метадычных комплексаў ахарактарызаваны ў пастанове калегіі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22.08.2002 г. № 8 (аб вучэбна-метадычных комплексах). Элементы вучэбна-метадычных комплексаў: падручнікі і вучэбныя дапаможнікі, вучэбныя праграмы, метадычныя ўказанні і планы семінарскіх і практычных заняткаў, разнастайных заданняў па самастойнай рабоце студэнтаў і іншыя акрэсліваюць змест і паслядоўнасць вывучэння дысцыплін, формы і графік кантролю за аўдыторнай і самастойнай работай студэнтаў.

Важнейшую ролю ў вучэбна-метадычных комплексах адыгрываюць падручнікі, вучэбныя дапаможнікі і вучэбныя праграмы. Менавіта яны даюць абагульненае ўяўленне аб курсе ў цэлым, прадстаўляюць матэрыял паслядоўна згодна са структурай навуковых ведаў, логікай іх вывучэння і засваення. У новых падручніках, вучэбных праграмах адлюстроўваецца сучасны стан бібліяграфазнаўства, мадэліруецца ўзровень прафесійных ведаў і уменняў будучых бібліятэкараў-бібліёграфаў.

Тэорыя і гісторыя бібліяграфазнаўства забяспечаны як вучэбнымі праграмамі і электроннымі тэкстамі лекцый, падручнікам і вучэбнымі дапаможнікамі, распрацаванымі выкладчыкамі кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, так і замежнымі падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі. У адпаведнасці з Адукацыйным стандартам падрыхтаваны новыя тыпавыя праграмы па тэорыі і гісторыі, якія інтэгравана падаюць вучэбны матэрыял па двух раздзелах.

Друкаваныя вучэбныя выданні, падрыхтаваныя на ФІДК, – гэта падручнік доктара педагагічных навук, прафесара В.Е.Лявончыкава “Беларуская бібліяграфія. Агульны курс” (1981 г., 1991 г. на рускай і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай мовах), вучэбны дапаможнік “Сусветная гісторыя бібліяграфіі” (2005 г., на беларускай мове) кандыдата педагагічных навук, дацэнта В.І.Саітавай. Уключаны ў план рэдакцыйнай падрыхтоўкі на 2010 г. вучэбны дапаможнік “Бібліяграфазнаўства. Тэорыя” кандыдата педагагічных навук, дацэнта Т.В.Кузьмініч. Па тэорыі і гісторыі беларускай бібліяграфіі ў апошнія гады створаны таксама электронныя курсы лекцый (аўтары Т.В.Кузьмініч і В.І.Саітава). Размешчаны ў электроннай бібліятэцы і вучэбны дапаможнік “Сусветная гісторыя бібліяграфіі”. Такім чынам, сёння можна канстатаваць наяўнасць па разглядаемых раздзелах і выкарыстанне ў працэсе навучання электронных і друкаваных вучэбных выданняў.

Электронныя выданні ў параўнанні з друкаванымі маюць шэраг пераваг, у тым ліку магчымасць абнаўлення інфармацыі. Лічым, што стварэнне друкаваных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў захоўвае сваю актуальнасць як традыцыйна даступны і зручны сродак прафесійнай адукацыі. Разам з тым неабходна іх далейшае ўдасканаленне: матэрыял магчыма прадставіць у выглядзе мультымедыйных баз даных, дадаць хрэстаматыйныя тэксты і забяспечыць гіпертэкставы пошук як у межах самога тэксту лекцый, так і па суправаджальных матэрыялах, дасягаючы выканання функцый трэніровачных і кантралюючых сістэм. Такі падыход будзе спрыяць паляпшэнню ўспрымання зместу дысцыплін, засваенню асноўных паняццяў, вывучэнню гістарычных фактаў, з'яў. Але для рэалізацыі названых і іншых магчымасцей і адпаведна дыдактычных пераваг электронных вучэбных комплексаў выкладчыкам гэтых дысцыплін патрэбна істотная дапамога праграмістаў.

Акрамя таго, у працэсе вывучэння дысцыплін актыўна выкарыстоўваюцца і расійскія вучэбныя выданні. Не страціў свайго значэння падручнік доктара педагагічных навук, прафесара А.П.Коршунава “Библиографоведение. Общий курс” (1990), які дастаткова прадстаўлены ў бібліятэцы ўніверсітэта (звыш 500 экз.). Але сёння гэты падручнік толькі часткова забяспечвае вывучэнне тэорыі бібліяграфіі. Два яго перавыданні (2001 і 2009) адсутнічаюць у бібліятэцы. Спадзяёмся на набыццё апошняга з іх: “Библиографоведение: основы теории и методологии” (аўтары А.П.Коршунаў, Т.Ф.Ліхавід і Т.А.Наважонава).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вучэбныя выданні іншых вядомых расійскіх бібліяграфазнаўцаў прадстаўлены ў бібліятэцы ўніверсітэта невялікай колькасцю экзэмпляраў і таму рэкамендуюцца для вывучэння асобных тэм, а таксама для семінарскіх заняткаў, самастойнай работы, падрыхтоўкі курсавых і дыпломных работ. Напрыклад, вучэбны дапаможнік “Теория библиографии”, створаны доктарам педагагічных навук, прафесарам М.Г.Вохрышавай (Самара, 2004), маецца ў колькасці 20 экзэмпляраў, падручнік “Общая библиография”, створаны доктарам педагагічных навук, прафесарам А.А.Грачыхіным для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў па кнігазнаўстве (М., 2000), – у колькасці 4 экзэмпляраў, вучэбны дапаможнік па бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці “Общее библиографоведение”, выдадзены доктарам педагагічных навук, прафесарам І.Г.Маргенштэрнам (СПб., 2005), – прадстаўлены 3 экзэмплярамі, вучэбны дапаможнік “Библиография: теоретико-методологические основания” (СПб., 2006), створаны доктарам педагагічных навук В.А.Факеевым для сістэмы дадатковай бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі, – 11 экзэмплярамі і інш.

Адметнасцю гэтых падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з’яўляецца раскрыццё аўтарскіх тэарэтычных палажэнняў. Таму ім уласцівы асаблівасці манаграфічных даследаванняў, іх засваенне патрабуе сур’ёзнай працы з боку студэнтаў і значнай дапамогі выкладчыкаў. Найбольш відавочныя аўтарскі падыход і істотнае адрозненне ад іншых інтэрпрэтацый пры вызначэнні асноўных катэгорый, паняццяў. На наш погляд, для авалодання прафесійнай тэрміналогіяй у вучэбных матэрыялах павінны выкарыстоўвацца асноўныя тэрміны, замацаваныя ў сучасных стандартах, у першую чаргу ГОСТ 7.0-99 СИБИД. Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения (СТБ ГОСТ 7.0-2004 СІБВС. Інфармацыйна-бібліятэчная дзейнасць, бібліяграфія. Тэрміны і азначэнні). Пашырэнне ўяўленняў аб асноўных паняццях дасягаецца шляхам разгляду і інтэрпрэтацыі аўтарскіх дэфініцый. Без гэтага ў ведах і ўяўленнях студэнтаў не будзе адлюстраваны сучасны ўзровень бібліяграфазнаўства.

Забеспячэнне вучэбнымі дапаможнікамі і падручнікамі па дысцыпліне “Бібліяграфазнаўства. Гісторыя” выглядае іншым чынам. Лепшым з новых замежных вучэбных дапаможнікаў з’яўляецца падручнік “Библиография. Раздел 2. Иностранная

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

библиография”, створаны для студэнтаў ВНУ па кнігазнаўстве кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам Л.Б.Грузінавай (М., 2003). Аднак недастатковасць экзэмпляраў у бібліятэцы і іншая тэматычная скіраванасць гэтай вучэбнай дысцыпліны ў параўнанні з праграмай выкладання дысцыпліны на ФІДК БДУ культуры і мастацтваў абмяжоўваюць яго выкарыстанне. Да таго ж трэба заўважыць, што падручнікаў па сусветнай гісторыі бібліяграфіі з уключэннем нацыянальнага, напрыклад расійскага, аспекту няма.

Аб’яднанне дзвюх раней самастойных гісторыка-бібліяграфічных дысцыплін актуалізуе пытанне аб падрыхтоўцы электроннага варыянта тэкстаў лекцый па гісторыі бібліяграфазнаўства, а ў перспектыве – друкаванага вучэбнага выдання.

Вывучэнне тэорыі і гісторыі бібліяграфіі немагчыма без выкарыстання навуковых і даведачных выданняў, матэрыялаў спецыяльнага перыядычнага друку. Яны рэкамендаваны да тэм семінарскіх і практычных заняткаў, да заданняў па самастойнай рабоце і інш. Айчынныя навуковыя публікацыі прадстаўлены толькі артыкуламі, апублікаванымі ў спецыяльным перыядычным друку і зборніках, у “Весніку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў”. Некаторыя са значных новых навуковых і даведачных выданняў, апублікаваных у Расіі, маюцца ў невялікай колькасці экзэмпляраў у бібліятэцы ўніверсітэта. У ліку іх 17 экзэмпляраў манаграфіі “Природа библиографического знания” доктара педагагічных навук В.А.Факеева, 5 экзэмпляраў тэрміналагічнага слоўніка “Библиографоведение. Информатика” гэтага ж вучонага і інш. Важнейшыя замежныя перыядычныя выданні “Библиография”, “Научные и технические библиотеки”, “Мир библиографии” і некаторыя іншыя, а таксама асноўныя беларускія бібліятэчныя перыядычныя выданні студэнты атрымліваюць толькі ў бібліятэцы, у кабінет кафедры зараз яны не паступаюць.

Актуальным для студэнтаў з’яўляецца забеспячэнне вучэбнага працэсу бібліяграфічнымі дапаможнікамі. Фонд іх у кабінеце кафедры даволі ўстарэлы, новыя расійскія і беларускія бібліяграфічныя крыніцы не набываюцца. Папаўненне фонду вядзецца толькі за кошт паступленняў у якасці дару бібліяграфічных выданняў беларускіх абласных бібліятэк і ЦБС. Значэнне бібліяграфічных выданняў у вучэбным працэсе вельмі высокае. З іх дапамогай студэнты лепш засвойваюць жанрава-відавыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарыстыкі бібліяграфічнай прадукцыі, яе метадычныя асаблівасці.

Пажадана больш актыўна выкарыстоўваць такія крыніцы папаўнення фондаў кабінета, як закупка і падпіска, а таксама выкарыстанне магчымасцей фонду ўнутрырэспубліканскага дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і іншых буйных бібліятэк краіны.

Падводзячы вынік, адзначым, што навукова-метадычнае і інфармацыйнае забеспячэнне выкладання бібліяграфазнаўства (тэорыя, гісторыя) вядзецца як шляхам стварэння айчынных вучэбных выданняў на беларускай мове, так і шляхам актыўнага выкарыстання расійскай прадукцыі. Паслядоўнае ўмацаванне вучэбна-метадычнай базы праз стварэнне нацыянальных тыпавых праграм, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, вучэбна-метадычных комплексаў – вызначаны кірунак дзейнасці кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый. На наш погляд, ён мог бы развівацца яшчэ актыўней пры ўмове фарміравання навуковай тэмы кафедры па распрацоўцы нацыянальных вучэбных выданняў па спецыяльнасці. Пастаянная аптымізацыя навукова-метадычнага і інфармацыйнага забеспячэння бібліяграфазнаўства (тэорыя, гісторыя), кірункі якога былі азначаны вышэй, паспрыяюць паспяховаму засваенню матэрыялу студэнтамі, у далейшым – прымяненню ведаў у практычнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ